ВІНШУЕМ

# БРАВА, КАЛЕГА!

**Шаноўныя сябры! У літаратурнай Гродзеншчыны вялікая радасць. Наша калега па Гродзенскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі, літаратуразнаўца Аліна САБУЦЬ стала лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Найлепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства».**

Кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, педагог, навуковец, грамадскі дзеяч уганаравана вышэйшай літаратурнай узнагародай за кнігу «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX—XXI стагоддзяў».

Крытыка – вельмі важны, адказны і працаёмкі від дзейнасці. Таму што не толькі ўключае ў сябе шырыню кампетэнцый, глыбіню спазнанняў, а яшчэ патрабуе ад даследчыка максімум такту, карэктнасці, далікатнасці. Праца нашай калегі па пісьменніцкай арганізацыі і атрыманая за яе высокая ўзнагарода наглядна даказваюць, што крытычнаму мысленню чалавека, накіраванаму ў канструктыўнае, стваральнае рэчышча, па сілах вобразна пераасэнсаваць творчы працэс, аптымізаваць яго вынікі і абудзіць цікавасць чытацкай аўдыторыі. Гэта значыць – зрабіць лёс мастацтва шчаслівым. Крытычная літаратура ў Беларусі вельмі запатрабаваная, таму што ад яе шмат у чым залежаць далейшыя шляхі айчыннага мастацтва слова. Самае галоўнае – што кніга Аліны Эдмундаўны Сабуць падкрэслівае сацыяльную значнасць айчыннай літаратуры, разглядаючы яе багатыя традыцыі і сучаснасць як надзвычай актуальны сёння дыялог светапоглядаў.




**Літаратуразнаўца з Гродна Аліна Сабуць атрымлівае Нацыянальную літаратурную прэмію з рук старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандра Карлюкевіча. 2 верасня 2023 года.**

***

Ад імя нашага творчага калектыву сардэчна віншуем нашу калегу, літаратуразнаўцу, літаратурнага крытыка Аліну Эдмундаўну Сабуць з атрыманнем высокай узнагароды – Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Шчыра жадаем Вам, шаноўная калега, моцнага здароўя, новых поспехаў і дасягненняў, невычарпальнай энергіі творцы, асветніка, вучонага, педагога, тым больш, што гарманічнае адзінства менавіта гэтых амплуа ў Вашай асобе, памножанае на бясцэнныя чалавечыя якасці – інтэлігентнасць, прыстойнасць і прыязнасць, дазволілі дасягнуць такога высокага выніку і разам з тым падняць на новы ўзровень развіцця літаратурны свет нашай Айчыны. Вы – наш гонар!

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
Гродзенскае абласное аддзяленне


ДЗЕНЬ
ДЫПЛОМ

